■ Прыёмная кампанія — 2017

# Тэсты не выходзяць за рамкі школьнай праграмы

## Пра гэта сведчаць 100-бальныя вынікі ўдзельнікаў ЦТ

**Учора ў цэнтралізаваным тэсціраванні была пастаўлена апошняя кропка: у Белдзяржуніверсітэце апошні свой экзамен здалі абітурыенты, якія прапусцілі іспыт у прызначаны дзень.**

Нагадаем, што з гэтага года ў абітурыентаў з'явілася магчымасць здаваць у рэзервовыя дні тры дысцыпліны і такім чынам не губляць цэлы год, напрыклад, з прычыны хваробы. Кожны зварот па дазвол удзельнічаць у ЦТ у рэзервовыя дні разглядаўся індывідуальна. Атрымалі яго 733 чалавекі. Адмоўлена ў праходжанні цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні было 17 абітурыентам з прычыны адсутнасці ў іх дакументаў, якія пацвярджаюць аб'ектыўнасць пропуску экзамену ў асноўны час. Усе тры іспыты ў рэзервовыя дні здавалі пераважна грамадзяне Расіі і Казахстана, якія не змаглі прыехаць у нашу краіну на ЦТ у асноўны час, а таксама спартсмены, якія на той момант знаходзіліся па-за межамі Беларусі.




| | Зарэгістраваліся абітурыентаў | Неяўка | Выдалена |
|---|---|---|---|
| беларуская мова | 28,5 тыс. | 4,7% | 0 |
| руская мова | 75,4 тыс. | 3,4% | 20 |
| грамадазнаўства | 16,9 тыс. | 5% | 0 |
| матэматыка | 51,5 тыс. | 4,6% | 4 |
| біялогія | 29,7 тыс. | 4,3% | 3 |
| замежная мова | 34,5 тыс. | 4,6% | 3 |
| хімія | 16 тыс. | 5,6% | 0 |
| фізіка | 30,1 тыс. | 7% | 1 |
| гісторыя Беларусі | 25,5 тыс. | 8% | 2 |
| геаграфія | 2,1 тыс. | 18,5% | 0 |
| сусветная гісторыя (навейшы час) | 2,1 тыс. | 15,7% | 0 |

**Для даведкі**

**У 2016 годзе 100 балаў абітурыенты атрымалі ў 330 выпадках па 12 вучэбных прадметах. Тры абітурыенты атрымалі 100 балаў па трох вучэбных прадметах і пятнаццаць — па двух.**

Як расказаў журналістам **старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО,** вынікі ЦТ 2017 года аказаліся не горшыя за леташнія. На 100 балаў тэсціраванне здалі 303 абітурыенты, 250 з іх з'яўляюцца выпускнікамі гэтага года, а 53 скончылі школу раней. Паказальна, што сярод шчаслівых уладальнікаў стабальных сертыфікатаў ёсць і выпускнікі самых звычайных сельскіх школ. Максімальныя 100 балаў па двух прадметах на ЦТ атрымалі 11 абітурыентаў. На думку Васіля Жарко, гэта сведчыць аб тым, што тэсты даступныя і адпавядаюць навучальнай праграме.

Усяго на ЦТ сёлета было зарэгістравана каля 92 тысяч абітурыентаў. Не прыйшлі на экзамен прыкладна 2 тысячы чалавек. З экзаменацыйнай аўдыторыі былі выдалены 33 абітурыенты (найбольшая колькасць — з ЦТ па рускай мове), пераважна за выкарыстанне мабільных тэлефонаў. За час правядзення тэсціравання члены дзяржкамісіі разгледзелі звароты 13 чалавек. «Камісія працягне працаваць і падчас прыёму дакументаў, які стартуе ўжо 12 ліпеня, і падчас правядзення ўнутрывузаўскіх іспытаў, каб гарантаваць абітурыентам сацыяльную справядлівасць і законнасць пры правядзенні ўступнай кампаніі», — падкрэсліў Васіль Жарко.

Між іншым, учора распачалася выдача сертыфікатаў удзельнікам асноўнай хвалі ЦТ. Абітурыенты, якія здавалі тэсты ў рэзервовыя дні, змогуць забраць свае сертыфікаты ў БДУ з 13 ліпеня.

Арганізатары ЦТ звяртаюць увагу абітурыентаў на адну важную акалічнасць: паколькі сертыфікат — афіцыйны дакумент, правяраць дакладнасць яго афармлення, у прыватнасці, правільнасць напісання прозвішча, імя і імя па бацьку, трэба неадкладна, інакш праблемы абавязкова ўзнікнуць ужо пры падачы дакументаў у прыёмную камісію. У тым выпадку, калі абітурыент сапсаваў або страціў сертыфікат, яго могуць замяніць. Для гэтага трэба звярнуцца ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў.

У выпадку замены дакумента, які сведчыць асобу, у першыя паміж датай рэгістрацыі ў якасці абітурыента і датай выдачы сертыфіката іншых афармлеецца ў адпаведнасці з дамымі новага дакумента, які сведчыць асобу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Класікі і сучаснасць

# У ВЯЗЫНКУ, ПА НАТХНЕННЕ

## 135-годдзе Песняра адзначылі на яго Радзіме

**Купалаўскі запаведнік «Вязынка» чарговы раз прымаў гасцей свята нараджэння народнага паэта Беларусі. Падобныя мерапрыемствы на малой радзіме Янкі Купалы ладзяцца ўжо сорак пяць гадоў як дні высокай паэзіі, музыкі, прыкладнога мастацтва, душэўнага адпачынку і міжкультурнага дыялогу. Сваю назву вёска атрымала ў гонар 90-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы ад наймення былога фальварка, у якім нарадзіўся паэт.**

Сёлетняя, юбілейная, сустрэча вызначалася маштабнасцю і разнастайнасцю. Свята «З адною думкаю аб шчасці Беларусі» ладзілася сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі, Мінскім аблвыканкамам, Маладзечанскім райвыканкамам.

З вітальным словам да ўдзельнікаў сустрэчы звярнуліся намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Васіль Чэрнік, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Францыі Павел Латушка, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах, дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч, старшыня Міжнароднага фонду імя Янкі Купалы Таццяна Сівец.

Вершы ў гонар Песняра чыталі паэты Віктар Шніп, Міхась Башлакоў, Уладзімір Скарынкін, Мікола Шабовіч, Іна Фралова, Юлія Алейчанка, Святлана Быкава, Віктар Кажура, Уладзімір Санунін, Бажэна Ганушкіна. Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры» прэзентаваў на свяце песні са свайго новага альбома «Шчаслівасць» на словы ранніх вершаў Янкі Купалы са зборніка «Жалейка». Прысвячалі музычныя творы песняру і салістка Беларускай дзяржаўнай філармоніі Марына Васілеўская, заслужаны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш», вакальны ансамбль «Заранак» Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя Уладзіміра Мулявіна, мастацкія калектывы Маладзечанскага раёна. Вялікі канцэртную праграму артыстка Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Валянціна Гарцуева і акцёр Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Андрэй Новік.

Дзень нараджэння паэта стаўся не толькі літаратурнай імпрэзай. Падчас свята праходзіў паказ беларускіх народных строяў, а кожны ахвотны мог далучыцца да вышывання святочнага ручніка. Можна было набыць на Купалавым свяце і кнігі, вырабы майстроў МінШчыны, смачныя пачастункі, зрабіць здымкі ў фотазонах.

Час даказаў: постаць Янкі Купалы яднае народы. Заканамерна, што на юбілей паэта прыехалі і прадстаўнікі многіх краін свету. З кранальнымі словамі захаплення яго творчасцю выступілі госці з Расіі, Украіны, Літвы.

Налета запаведнік Вязынка адзначыць сваё 70-годдзе. Верыцца, што гэты юбілей таксама стане яркай старонкай культурнага жыцця нашай краіны і замежжа.

**Юлія АЛЕЙЧАНКА**

■ Надвор'е

# САГРЭЕМСЯ?

## Сёння на поўдні прыпячэ да 30—34 цяпла!

**На гэтым тыдні ў Беларусі захаваецца няўстойлівае надвор'е, гэта калі ў першай палове тыдня будзе цёпла, а вось у другой — пахаладае, расказала намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Белгідрамета Святлана РЫБАКОВА.**


Фота Івана КУПАРВАСА.

У аўторак раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца навальнічныя дажджы, месцамі моцныя лівні. Удзень пры навальніцах у асобных раёнах град і шквалістае ўзмацненне ветру парывамі 15—20 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад плюс 23 да плюс 29 градусаў, а ў паўднёвых раёнах краіны паветра прагрэецца да 30—34 цяпла. Захаваецца цёплае няўстойлівае надвор'е і ў сераду, калі на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, а ўначы ў асобных раёнах моцныя дажджы. Месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 12—18 цяпла, па паўднёвым усходзе да плюс 20 градусаў, максімальная ўдзень складзе ад плюс 20 да плюс 27 градусаў.

Чакаецца, што ў чацвер умовы надвор'я будуць вызначаць атмасферныя франты, і днём заходнія раёны краіны апынуцца пад уплывам халодных няўстойлівых паветраных мас. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 11 да плюс 18 градусаў, максімальная ўдзень складзе 21—27 цяпла, па паўднёвым усходзе да плюс 29 градусаў. А вось у заходніх раёнах краіны стане халадней — там усяго 18—20 цяпла. У пятніцу тэрыторыя Беларусі апынецца пад уплывам чарговай сістэмы атмасферных франтоў, за якімі да нас распаўсюдзіцца халаднаватае паветра са Скандынавіі. На большай частцы тэрыторыі нашай краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах чакаюцца навальніцы і моцныя дажджы, удзень узмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с, магчымы град. Тэмпература паветра ўначы 12—19 цяпла, удзень ад плюс 15 да плюс 22 градусаў, толькі па ўсходзе паветра яшчэ прагрэецца да 25 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Чулі?!

# Зарабіць амаль 14 млн USD за год

**За мінулы год адзін жыхар Мінска задэклараваў самы вялікі даход, які склаў 27,9 млн рублёў, або амаль 14 мільёнаў долараў. Аб гэтым паведаміла намеснік начальніка — начальнік упраўлення падаткаабкладання арганізацый інспекцыі па падатках і зборах горада Мінска Вольга КІШКО.**

А заплаціў найбольшую суму падаходнага падатку за мінулы год (2,7 млн рублёў) другі жыхар Мінска, які задэклараваў даход у памеры 21,4 млн рублёў. У асноўным дэкларацыі прадстаўляліся ў сувязі з атрыманнем даходаў за мяжой (ці з-за мяжы) і ад продажу ўласнай маёмасці. Усяго падатковыя дэкларацыі па падаходным падатку з фізічных асоб у бягучым годзе падалі каля 11 тысяч мінчан. Грамадзянам прад'яўлена да выплаты больш за 26 млн рублёў.

Ужо традыцыйна ў пачатку года стартуе дэкларацыйная кампанія. Падаткаабкладанню падлягаюць даходы, атрыманыя за мяжой, ад продажу на працягу каляндарнага года двух і больш легкавых аўтамабіляў, ад продажу на працягу пяці гадоў больш аднаго аб'екта нерухомасці або зямельнага ўчастка (у гэтую катэгорыю не ўваходзіць маёмасць, якая адчужаецца і атрымана па спадчыне) і інш.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

Государственное предприятие «Президент-Отель» извещает об отмене аукциона в отношении лота №1 (часть помещения №2, площадью 10,00 кв. м, на первом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске), извещение о проведении которого опубликовано в выпуске газеты «Звязда» от 08.06.2017 №107 (28471) на стр. 11.
УНП 192750936

■ Небяспека

# ДЗІКІЯ ЖЫВЁЛЫ — ПРЫЧЫНА ДТЗ

## З-за ласёў і лісы за мінулыя суткі адбылося тры ДТЗ у Мінскім і Светлагорскім раёнах

**Асаблівую небяспеку дзікія жывёлы ўяўляюць для вадзіцеляў у цёмны час сутак. На мінулым тыдні толькі ў Мінскім раёне практычна кожны дзень адбываліся такія транспартныя здарэнні. Падобныя ДТЗ зафіксаваны і ў Светлагорскім раёне. У выніку аварый жывёлы гінулі, а вадзіцелі і пасажыры атрымлівалі цяжкія траўмы.**

8 ліпеня каля паловы на адзінаццатую вечара на 18-м км аўтадарогі Р1 Мінск—Дзяржынск аўтамабілем «Фольксваген-Пасат» быў здзейснены наезд на лася, які нечакана выйшаў на праезную частку. У выніку ДТЗ 28-гадовая пасажырка «Пасата» атрымала сур'ёзныя траўмы і была шпіталізавана. Жывёла загінула на месцы.

Літаральна праз гадзіну ў гэты ж вечар у Мінскім раёне адбылося яшчэ адно ДТЗ з удзелам ласся — на аўтадарозе М2 Мінск—Нацыянальны аэрапорт, побач з гандлёвым прадпрыемствам «Віталюр». Зноў жа быў здзейснены наезд на дзікую жывёлу. Аўтамабіль «Мазда» атрымаў механічныя пашкоджанні. Затое, на шчасце, людзі ў аварыі не пацярпелі.

Акрамя гэтага, падобнае ДТЗ у той жа дзень адбылося і ў Светлагорскім раёне. Аварыя здарылася на аўтадарозе Н4254 у раёне санаторыя «Сасновы бор». Як паведамляюць відавочцы аварыі ў сацыяльных сетках, легкавы аўтамабіль «Мерседэс» урэзаўся ў слуп з-за лісы, якая таксама раптоўна выбегла на дарогу.

«Кіроўца вывернуў руль і прымяніў экстраннае тармажэнне, каб пазбегнуць сутыкнення з жывёлай. У выніку машыну развярнула і адкінула ў прыдарожны жалезабетонны слуп», — паведамляюць відавочцы аварыі. Як стала вядома, ніхто з пасажыраў аўтамабіля ў ДТЗ не пацярпеў, а ліса збегла з месца здарэння.

Часта паступалі паведамленні аб нечаканых сустрэчах з дзікімі жывёламі на праезнай частцы і ў іншых раёнах краіны. У гэтай сувязі ДАІ заклікае кіроўцаў быць надзвычай уважлівымі на дарогах, асабліва ў цёмны час сутак.

**Ганна КУРТАСАВА**